**Крывец, М.** Юнацтва, апаленае Афганам / М. Крывец // Лепельскі край. — 2006. — 20 студз. — С. 2.

## ЮНАЦТВА, АПАЛЕНАЕ АФГАНАМ

З Аляксандрам Міллерам давялося пазнаёміцца мінулай восенню падчас правядзення сяўбы азімых. У сельгаскааператыве «Лядненскі» на аўтазапраўшчыку ён падвозіў насенне жыта сейбітам. На той момант не было часу больш падрабязна пагаварыць з Аляксандрам. Ведаў, што ў яго цікавая біяграфія. Другая сустрэча адбылася ўжо зімой гэтага года.

– Прозвішча Міллер наводзіць на роздум аб вашым паходжанні. Можаце што-небудзь патлумачыць?

– Калі ласка. Мой бацька Леанід Густававіч па нацыянальнасці немец, дзед быў з перасяленцаў. Жыла наша сям'я ў Казахстане, дзе я і нарадзіўся. У 1971 годзе мы пераехалі ў Лепель, жылі ў пасёлку льнозавода. Потым – школа, вучоба ў тэхнікуме, армія.

Служба праходзіла ў А. Міллера няпроста. Спачатку накіравалі ва Узбекістан у горад Тэрмез, а ўжо праз тры месяцы ён трапіў у Афганістан.

– Там ужо ішла вайна?

– Так, але аб гэтым у той час адкрыта не гаварылі. Замест баявых дзеянняў пісалі «ідуць вучэнні».

– Цяжка было?

– Не тое слова. Было страшна, бо заўсёды побач хадзіла смерць. Гінулі хлопцы, ніхто з нас не ведаў што прынясе заўтрашні дзень.

З чэрвеня 1982 і па снежань 1983 года калясіў Аляксандр па афганскіх дарогах на ГАЗ-66. Непасрэдны ўдзел у баявых дзеяннях ён не прымаў. Яго задачай было своечасова дастаўляць пітную ваду на баявыя пазіцыі, іншыя кропкі воінскіх падраздзяленняў. Няцяжка здагадацца, што перажываў хлопец перад кожным выездам у рэйс. У любы момант можна быдо сустрэць засаду душманаў, наехаць на замініраваны ўчастак дарогі. Кожны выезд суправаджаўся павышанай рызыкай.

– А што, выезды праводзіліся ў адзіночку?

– Ды не. Апрача вады дастаўляліся прадукты харчавання, боепрыпасы, ваенная амуніцыя. Нас суправаджалі ўзвод або рота аховы. Тым не менш, здараліся розныя нечаканасці.

Аляксандру Міллеру, можна лічыць, пашанцавала, дамоў вярнуўся, як кажуць, цэлым і не параненым.

Пасля службы Аляксандр закончыў вучобу ў Лепельскім тэхнікуме, набыў спецыяльнасць механіка.

Уладкаваўся працаваць вадзіцелем аўтамашыны ў калгасе імя Чапаева. На працягу 20 гадоў адвозіць малако з фермаў на малаказавод. Апошнім часам збірае яшчэ малако і ад насельніцтва.

– Аляксандар Леанідавіч, як «афганец» карыстаецеся ільготамі?

– Абавязкова. Дом, у якім жывём, куплялі самі, але па палавіннаму кошту. У перабудоўчыя гады цяжка было купіць мэблю. Нам такую магчымасць мясцовая ўлада прадстаўляла. Як «афганцу» выдаюцца бясплатныя пуцёўкі ў санаторыі.

У Аляксандра Леанідавіча і Галіны Эдуардаўны Міллераў ёсць два сыны. Старэйшы Ігар, як і бацька, працуе вадзіцелем аўтамашыны. Малодшы Алег вучыцца ў Лепельскім аграрна-тэхнічным каледжы на механіка. Хутчэй за ўсё і ён будзе працягваць справу бацькі.

**М. Крывец**